# Дзеўка-паэт, ці «Веру ў каханне-дранік!»

**У кастрычніку ёй споўнілася 24 гады. Але яна ўжо — аўтар трох кніг паэзіі ("Кроў Сусвету", "Каб неба сагрэць...", "Тамсама"), магістр мастацтвазнаўства, рэдактар выдавецтва "Мастацкая літаратура"... Пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў па спецыяльнасці кінадраматургія, яна вагалася, што абраць: кінематограф, тэатр, філасофію ці літаратуразнаўства? Абрала кіно. Сёлета абараніла дысертацыю на тэму «Увасабленне архетыпічных вобразаў і матываў у экранізацыях твораў Уладзіміра Караткевіча». Наперадзе аспірантура... З паэтам Валерыяй, Валярынай, ці — лепш — Валерушкай, як пяшчотна называе яе маці, Куставай мы сядзім у яе паэтычна-ружовым пакоі, п'ём зялёную гарбату і размаўляем пра літаратуру.**



**— Чаму ты называеш сябе «дзеўка-паэт», а не паэтка?**

— Гэта Ясенін — паэтка *(жартаўліва)*. У мяне нават ёсць рэйтынг заняпаду: спачатку паэт, пасля паэтка, а потым — зусім паэтэса *(смяецца)*. Я пачала пісаць *(а адбылося гэта ў 3-гадовым узросце. — **А.П.**)* свае першыя творы ад імя чалавека ў мужчынскім родзе. Я заўсёды пачувалася не паэтам-асобай ці паэтам-жанчынай, а менавіта паэтам-чалавекам. Бывае, што мужык, але паэтка, а бывае, дзеўка, але паэт. Гэта той стрыжань, які адчуваю ў сабе.

**— Ты даволі часта выступаеш. Як публіка рэагуе на тваю паэзію?**

— Мне вельмі падабаецца выступаць у тэхналагічным універсітэце. Там заўсёды збіраецца шмат студэнтаў. Усталёўваецца такая цішыня, што можна пачуць, як пралятае муха, і толькі твой голас у гэтай цішыні... Уваходзіш у экстаз і атрымліваецца надзвычай станоўчы абмен энергіяй. Мне ўвогуле падабаецца выступаць. І ў школах таксама.

Так атрымліваецца, што кожны мой выступ — дыялог са слухачамі. Калі бяру з сабой гітару, то мы спяваем народныя песні, гарадскія рамансы, я выконваю і свае творы пад музычнае аздабленне. Старшакласнікі часта задаюць пытанні не толькі пра літаратуру ды літаратараў, а пытаюцца і наконт абрання далейшага шляху, будучай прафесіі, просяць парады... Даводзіцца распавядаць і пра нашы навучальныя ўстановы... Вельмі часта просяць расказаць пра каханне. Паэзія літаратурная пераходзіць у паэзію жыцця і само жыццё.

**— Сёлета ў рамках трэцяга міжнароднага фестывалю сучаснай паэзіі «Парадак слоў» адбыўся першы беларускі слэм, у якім ты ўдзельнічала. Падзяліся ўражаннямі.**

— На вуліцы выпадкова сустрэліся з Андрэем Хадановічам, і ён прапанаваў прыйсці і тры хвіліны пахуліганіць. Мяне здзівіла: чаму тры, а не пятнаццаць? *(смяецца)*. На той момант я абсалютна не ведала, што такое слэм, у якім фармаце ён адбываецца. Нават вершы на памяць не вывучыла. Ну, павыдурняцца дык павыдурняцца. У мяне ёсць верш «Каханне-дранік». Пачынаецца ён так: «Не веру ў моркву-каханне, // веру ў каханне-дранік, // веру ў каханне-бульбу, // веру ў бульбоўнік кахання!» Я ўсё думала, што можна такога зрабіць, каб ён сапраўды па-хуліканску глядзеўся. Думала-думала і вырашыла выкарыстаць моркву і бульбіну ў сваім нумары... На жаль, не хапіла часу на дранікі, якія я хацела прыгатаваць ды прынесці...

Слэм — неблагі спосаб для папулярызацыі літаратуры. Ёсць, праўда, небяспека загуляцца альбо зацыкліцца на напісанні вершаў выключна ў фармаце слэму.

**— Ты закранула актуальную тэму папулярызацыі літаратуры...**

— Мне раней здавалася, што калі людзі патрапяць на нейкую вясёлую, сцёбную вечарыну, то яны пасля пойдуць шукаць штосьці больш сур'ёзнае і такім чынам далучацца да літаратуры. Думалася, што гэтая весялосць у літаратуры будзе толькі штуршком для чытачоў і гледачоў пайсці далей... Але я памылялася. Насамрэч, людзі, якія не маюць дачынення да літаратуры, трапіўшы на такую вечарыну, на гэтым і спыняюцца, думаючы, што гэта літаратурная вышка. Такія імпрэзы, вядома, таксама папулярызацыя, але пытанне, у якой ступені і якой літаратуры. У нас няма літаратурных агентаў, што вельмі блага. Бо калі ў цябе ёсць талент, так бы мовіць, прасоўвання, ты можаш быць нашмат больш папулярным літаратарам, чым калі маеш літаратурны талент. Сёння, акрамя непасрэднай творчасці, трэба быць і менеджэрам, і піяр-агентам...

Цяпер іншыя прыярытэты. Нельга сказаць, што літаратура прыйшла ў заняпад. Яна існуе, і я адчуваю, што неўзабаве мусіць з'явіцца выбуховы твор. І ўжо некалькі такіх твораў (паэм) з'явілася, але так і не атрымала розгаласу. І гэта вельмі нядобра. Дзіўна, што самім беларускім літаратарам «у лом» хваліць добрыя творы сваіх калег, калі тыя не з'яўляюцца іх сябрамі, суседзямі ці супрацоўнікамі... Гэта замкнёнае кола. Беларусы звыкліся недаацэньваць сябе і сваіх. А калі сам сябе не пахваліш, то хто тады пахваліць?.. Нікому мы не будзем патрэбныя. Але ўсё ў нас будзе добра.

**Ася ПАПЛАЎСКАЯ**

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ